**Прафарыентацыйныя заняткі з элементамі трэнінгу**

**“У свеце прафесій”**

**Фарміраванне прафесійнага самавызначэння навучэнцаў 9–11 класаў праз трэнінг на аснове гульнявой тэхналогіі**

**Зінаіда Іванаўна Максімовіч,**
педагог сацыяльны
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Гарадзечненскай СШ Навагрудскага раёна

**У сучасным свеце, дзе рынак працы вельмі зменлівы, прафесійнае самавызначэнне становіцца галоўным складнікам у прыняцці жыццёва важных рашэнняў. Паспяховы выбар прафесіі вызначае не толькі кар'ерныя перспектывы, але і асабістае задавальненне, стабільнасць і магчымасць самарэалізацыі. Педагогу важна выкарыстоўваць сучасныя інструменты і формы прафарыентацыйнай работы, каб дапамагчы навучэнцам зрабіць усвядомлены і абгрунтаваны выбар.**

**Мэты:**
– пашырэнне ў навучэнцаў ведаў аб свеце прафесій, актуалізацыя наяўных ведаў;
– на асацыятыўным, вобразным узроўні навучыць дзяцей суадносіць чалавека (у тым ліку, самога сябе) з прафесіямі і, такім чынам, павысіць іх гатоўнасць адрозніваць прафесійныя стэрэатыпы;
– усвядоміць спецыфічныя моманты прафесійнай дзейнасці.

**Задачы:**
- стварыць пазітыўную ўстаноўку на даверлівыя зносіны;
- павысіць узровень арыентацыі ў свеце прафесійнай працы;
- – выпрацаваць уменні суаднесці якасці работніка з патрабаваннямі прафесіі.

**Чаканы вынік:** усведамленне навучэнцамі неабходнасці суаднясення сваіх магчымасцяў з патрабаваннямі меркаванай прафесіі.

**Абсталяванне:** крэслы, магнітная дошка, магніты, ватман, маркеры, запіс з рэлаксацыйнай музыкай, камп’ютэр, экран, мультымедыйны праектар.

**Форма правядзення:** прафарыентацыйныя заняткі з элементамі трэнінгу, асновай якога з’яўляецца гульнявая тэхналогія.

**Форма работы:** групавая.

**План заняткаў:**
1. Прывітанне, уступнае слова вядучага.
2. Практыкаванне “Прафесія на літару... “.
3. Дэманстрацыя відэароліка на тэму “Разнастайнасць свету прафесій”.

4. Энергізатар “Салата з прафесій”.
5. Практыкаванне “Адгадай прафесію”.
6. Практыкаванне “Ланцужок прафесій”.
7. Энергізатар “ Памяняйцеся месцамі, хто… ”.
8. Практыкаванне “ Хто есць хто? ”.
9. Творчае заданне “Калаж”.
10. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія занятку.
11. Рытуал развітання.

**Ход заняткаў:**

**1.** а) Навучэнцы разам з вядучым садзяцца ў вялікі круг.
б) Практыкаванне “Раз слаўцо, два слаўцо” (прывітанне).

**Мэта:** стварыць спрыяльную атмасферу ў групе.

Вядучы прапануе навучэнцам скласці агульнае прывітанне ад усіх і кожнага, усім і кожнаму. Удзельнікі трэнінгу па чарзе (пачынае вядучы) гавораць па адным слове. Кожны наступны член групы дапаўняе папярэдняга. Вядучы гаворыць “СТОП”, калі тэкст прывітання становіцца завершаным.

в) Вядучы нагадвае правілы паводзін у трэнінгавай групе.

– актыўнасць;
– права на адмову;
– канфідэнцыяльнасць;
– тут і цяпер;
– узаемадапамога і ўзаемавыручка.

Да пералічаных правіл кожная группа можа дадаць свае правілы.

**Вядучы:** Праблема выбару прафессіі старая, як гэты свет. Удала выбраная прафесія павышая самапавагу, пазітыўнае ўяўленне чалавека пра сябе і ўзмацняе задаволеннасць жыццём. Таму так важна чалавеку, які ўступае ў самастойнае жыццё, зрабіць правільны выбар. Выбар прафесіі толькі тады будзе правільным, калі ён усвядомлены, самастойны і калі яму папярэднічае вялікая клапатлівая праца па самапазнанні і вывучэнню свету прафесій.

**2.** Практыкаванне «Прафесія на літару...”

**Мэта:** пашырыць веды вучняў аб свеце прафесій.

**Вядучы:** зараз мы з вамі пагуляем у гульню, якая па сваіх правілах нагадвае ўсім вядомыя “Гарады”. Толькі замест гарадоў мы будзем называць прафесіі, гэта азначае, што першы ўдзельнік называе якую-небудзь прафесію, наступны ўдзельнік называе прафесію, якая пачынаецца на літару, на якую скончылася папярэдняя прафесія і гэдак далей.

**Абмеркаванне:**

– Якія цяжкасці вы адчувалі падбіраючы прафесію на зададзеную літару?
– Якую новую прафесію вы даведаліся?

**Вядучы:** Спецыялісты сцвярджаюць, што цяпер у свеце існуе больш за 40 тысяч прафесіі і спецыяльнасцей. Свет прафесій разнастайны.

**3.** Дэманстрацыя відэароліка на тэму: “Разнастайнасць свету прафесій”.

**4.** Энергізатар “Салата з прафесій”.

**Мэта:** уцягнуць удзельнікаў у дзеянне, павысіць агульную актыўнасць. узмацніць канцэнтрацыю ўвагі.

Вядучы стаіць у цэнтры круга. Паміж удзельнікамі размяркоўваюцца 3 прафесіі (урач, настаўнік, выратавальнік) па прынцыпе 1-ы, 2-і, 3-і. Далей вядучы просіць памяняцца мясцамі прадстаўнікоў якой-небудзь адной прафесіі, а сам у гэты час спрабуе сесці на вызваленае месца. Удзельнік, які застаўся без месца, становіцца вядучым.

**5.** Практыкаванне “Адгадай прафесію”.

**Мэта:** развіць уменні суадносіць асабістыя якасці з патрабаваннямі розных прафесій.

Вядучы: Адгадайце прафесію.

Прыклады сінквейнаў:

**1.** Які лічыць і адказвае за грошы. Улічвае, асвойвае, выконвае. Захоўвае сродкі для прадпрыемства. (Эканаміст, бухгалтар).

**2.** Шматгранны, экстравагантны. Творыць, упрыгожвае, ставарае. Заўсёды непаўторны вынік працы. (Дызайнер-мастак).

**3.** Разбіраецца, прадпрымальны. Чэрціць, канструюе, укараняе. Можа абслугоўваць тэхніку і кіраваць. (Механік, інжынер.)

**4.** Творчы. Адорвае, хвалюецца, развіваецца. Часта паўстае ў розных вобразах. (Акцёр.)

**5.** Пільны, бясстрашны. Кантактуе, арганізоўвае, адказвае, ратуе Узнагароджваюць, прысвойваючы пазачарговае званне. (Міліцыянер, ратавальнік.)

Абмеркаванне:

– Якія цяжкасці ўзніклі падчас працы?

– Чаму вы навучыліся, выконваючы дадзенае практыкаванне?

**Вядучы:** Псіхолагі лічаць, што пры выбары прафесіі вельмі важна адпаведнасць паміж псіхалагічнымі асаблівасцямі чалавека і характарыстыкамі будучай працы. Калі табе падабаюцца жывёлы, расліны, то табе будзе цікава ў сваёй прафесійнай дзейнасці сутыкацца з аб’ектамі жывой прыроды. Калі ты любіш тэхніку — цікавасць да яе будзе падтрымліваць цябе ў дзейнасці інжынера, канструктара, механізатара. Любая прафесія патрабуе, каб у чалавека прысутнічалі так званыя “прафесійна важныя якасці”, напрыклад, мастаку важна вобразнае мысленне, а хлебаробу – пах зямлі і хлеба, любоў да тэхнікі. Таму, выбіраючы пэўную прафесію, важна ўсвядоміць, ці ёсць у цябе

здольнасці. І калі ты сумняваешся, то выбірай тую прафесію, дзе твае здольнасці будуць максімальна рэалізаваны і дзе ты зможаш дасягнуць найбольшага поспеху.

**6.** Практыкаванне “Ланцужок прафесій”.

**Мэта:** развіць уменне вылучаць агульнае ў розных відах працоўнай дзейнасці; паказаць удзельнікам групы, што не варта абмяжоўвацца толькі адным прафесійным выбарам, так як вельмі часта тое, што яны шукаюць толькі ў адной прафесіі, можа апынуцца ў іншых, больш даступных прафесіях.

**Вядучы:** Цяпер мы пабудуем “ланцужок прафесій”. Я называю прафесію, напрыклад, настаўнік, наступны называе прафесію, чымсьці блізкую настаўніку, напрыклад, артыст. Наступны называе прафесію, блізкую да артыста. Па ходу гульні вядучы задае ўдакладняючыя пытанні, тыпу: “У чым жа падабенства вашай прафесіі з толькі штоназванай?”. Канчатковае рашэнне аб тым, удала названая прафесія ці не, прымае група.

**Абмеркаванне:**

– Лёгка ці цяжка было падбіраць прафесію да раней зададзенай?

– Ці здзівіў вас выбар аднакласнікаў?

**Вядучы:** Такія нечаканыя сувязі паміж самымі рознымі прафесіямі сведчаць аб тым, што не варта абмяжоўвацца толькі адным прафесійным выбарам, бо вельмі часта тое, што вы шукаеце ў адной прафесіі, можа апынуцца ў іншых, больш даступных прафесіях.

**7.** Энергізатар “Памяняйцеся месцамі, хто...”.

**Мэта:** зняць напружанасць і стомленасць.

Вядучы стаіць у цэнтры круга і просіць памяняцца месцамі тых, хто:

хоча працаваць у Мінску;

хоча зарабляць шмат грошай;

хоча працаваць у школе;

хоча атрымаць вышэйшую адукацыю;

цікавіцца машынамі;

не хоча ісці працаваць;

выбірае прафесію бацькоў;

яшчэ не выбраў прафесію;

хоча стаць вядомым.

**8.** Практыкаванне “Хто ёсць хто?”

**Мэта:** суаднесці вобраз удзельніка трэнінгу з патрабаваннямі розных прафесій.

Вядучы называе прафесію, кожны на працягу некалькіх секунд павінен паглядзець на сваіх таварышаў і вызначыць, каму гэтая прафесія падыдзе ў найбольшай ступені. Далей вядучы пляскае ў далоні, і ўсе па камандзе павінны паказаць на абранага чалавека. Паказаўшы рукой на таварыша, усе заміраюць, а

вядучы падлічвае, колькі рук паказвае на кожнага чалавека, гэта значыць, чый вобраз, на думку ўдзельнікаў, у найбольшай ступені адпавядае дадзенай прафесіі (настаўнік, эканаміст, заатэхнік, урач, эколаг, аўтамеханік, ратавальнік, міліцыянер, лётчык, механізатар і г.д.). Абмеркаванне:
– Якія пачуцці паўсталі падчас выканання практыкавання?
– Ці лёгка было суаднесці прафесію з канкрэтным чалавекам?
**9.** Творчае заданне “Складанне сінквейна”.
**Мэта:** усвядоміць асаблівасці прафесій, развіць навыкі канструктыўнага ўзаемадзеяння ў малой групе, актывізаваць творчы патэнцыял.
**Вядучы:** Сінквейн – гэта верш з 5 радкоў. Зараз мы разлічымся на 1-ы, 2-і, 3-і і падзелімся на 3 групы. Кожная каманда выбярэ сабе пэўную прафесію і складзе сінквейн. Вам неабходна адлюстраваць асаблівасці прафесійнай дзейнасці людзей дадзенай сферы, прафесійна важныя якасці (вучням раздаюцца правілы складання синквейна). Пасля заканчэння кожная каманда прэзентуе свой сінквей, а астатнія ўдзельнікі павінны адгадаць прафесію.
**Абмеркаванне:**
– Што вам было лёгка, што цяжка ў выкананні задання?
– Вызначце найбольш актыўных удзельнікаў выканання задання, лёгка ці цяжка было вызначыць лідара каманды?
**Вядучы:** Заняткі хочацца завяршыць выказваннем: “Далёка ў жыцці ідзе той, хто ідзе цвёрда да абранай мэты. Знайдзі ў маладосці сваю прафесію, вызнач жыццёвую дарогу і ідзі па ёй упарта да вызначанай мэты – тады атрымаецца ў цябе жыццё”.
**10.** Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія занятку.
**Мэта:** падвядзенне вынікаў занятку. (Гэта практыкаванне дазваляе педагогу зірнуць на занятак вачыма вучняў, прааналізаваць яго з пункту гледжання каштоўнасці для кожнага вучня) .
**Вядучы:**
– Што вы адчуваеце?
– Якія практыкаванні трэнінгу вам больш за ўсё спадабаліся?
– Якое самае важнае адкрыццё вы зрабілі на гэтых занятках?
– З якім колерам асацыіруюцца ў вас нашы заняткі?
**11.** Рытуал развітання.
Вядучы стварае з навучэнцамі круг, выцягвае правую руку далонню ўверх. Яны кладуць па чарзе свае правыя рукі ў руку вядучага, называючы прывабную, на іх погляд, прафесію. У завяршэнні робіцца “салют” з рук.

## Літаратура

1. Галашток А.Я. Выбар прафесіі і выхаванне асобы  школьніка / А.Я.Галашток – М.: Педагогіка, 2006 – 125 с.
2. Емякееў А.А. Роля сям'і ў выбары прафесійнай дзейнасці. Сацыялогія прафесій і сацыяльных груп / А.А.Емякееў – М.: Акадэмія, 2008. – 54 с.
3. Кавалёў С.В. Псіхалогія сучаснай сям'і / С.В.Кавалёў – Масква: Акадэмія, 2008.
4. Кухарчук, А. М. Псіхадыягностыкі ў прафесійным самавызначэнні вучняў: дапаможнік для класных кіраўнікоў, псіхолагаў, сацыяльных педагогаў агульнаадукацыйных школ / А. М. Кухарчук, А. Л. Сядова, В. В. Лях. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 63 с.
5. Кухарчук, А. М. Чалавек і яго прафесія: вучэбны дапаможнік / А. М. Кухарчук. – Мнінск: Сучаснае слова, 2006. – 45 с.
6. Прафесійная арыентацыя навучэнцаў. / склад. А. А. Хаткевіч. Мнінск : Красіка-Прынт, 2004. – 123 с.
7. Рэзапкіна, Г. В. Сакрэты выбару прафесіі, або Даведнік выпускніка / Г. В. Рэзапкіна. – М.: Генезіс, 2005. – 56 с.
8. Рэзапкіна, Г. В. Я і мая прафесія / Г. В. Рэзапкіна. – М.: Генэзіс, 2004.
9. Тарасевіч, С. В. Прафарыентацыя ў школе / С. В. Тарасевіч, Н.А.Шаліма і інш.. Мінск.. Красіка-Прынт. – 2007. – 124 с.
10. Хаткевіч, А. А. Прафесійная арыентацыя вучняў / А. А. Хаткевіч. – Мінск.: Красіка-Прынт, 2004. – 78 с.
11. Чалавек і яго прафесія: вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ / А. М. Кухарчук, В. В. Лях, А. Б. Шырокава. – Мінск: Сучаснае слова, 2006. – 145 с.